ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (1136) ● 24 чэрвеня 1976 г. ● ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## ПРЫЗНАЧЭННЕ НАСТАЎНІКА

РАШЭННІ XXV з'езда КПСС узброілі савецкае настаўніцтва, органы народнай асветы перспектыўнай праграмай дзеянняў. Удасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе, павышэнне яго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, паляпшэнне якасці і эфектыўнасці— магістральныя шляхі, вызначаныя XXV з'ездам партыі. У вырашэнні гэтых задач важная роля належыць павышэнню кваліфікацыі настаўнікаў, паляпшэнню іх прафесіянальнага майстэрства.

На аснове шматгадовай практыкі і вопыту выпрацаваліся асноўныя формы падрыхтоўкі і павышэння педагагічнай кваліфікацыі выкладчыцкіх кадраў з агульнаадукацыйных школ. Гэта—курсы ў інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, гарадскія і раённыя семінары на базе ІУН, раённыя міжшкольныя семінары на базе рай(гар)ана, занальныя семінары пры метадычных кабінетах рай(гар)ана, індывідуальныя і групавыя кансультацыі ў раённым метадычным кабінеце і ІУН, універсітэты педагагічных ведаў, навукова-практычныя канферэнцыі, раённыя і гарадскія педагагічныя чытанні, метадычная работа ў школе, семаадукацыя.

Ва ўдасканаленні ідэйна-палітычнай загартоўкі настаўніцтва і іншых работнікаў народнай адукацыі вялікае месца належыць вучобе ў сістэме палітычнай асветы: тэарэтычных семінарах па праблемах камуністычнага выхавання, навуковага камунізму, асновах марксісцка-ленінскай этыкі і іншых.

Сёлета курсы ўдасканалення настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры працуюць на базе філалагічнага факультэта БДУ з 7 чэрвеня.

У тэматычны план курсаў уключаны пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі, тэорыі навучання і выхавання.

Вялікае кола пытанняў уключана ў раздзелы па тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўцы па беларускай мове і літаратуры.

Настаўнікі, якія сёлета прыбылі на чарговыя курсы павышэння кваліфікацыі, павінны, улічваючы бюджэт часу, не толькі праслухаць лекцыі, але і дэталёва пазнаёміцца з навінкамі метадычнай і тэарэтычнай літаратуры. З гэтай мэтай неабходна так спланаваць працу, каб пасля практычных заняткаў наведаць бібліятэкі, кабінеты беларускай мовы і літаратуры ВНУ г. Мінска. Змястоўны канспект — асноўны рабочы паказчык слухача курсаў. Варта ўсім настаўнікам падрыхтаваць рэферат, выступленне або паведамленне з вопыту сваёй работы на адну з тэм, па якіх будуць чытацца лекцыі і праводзіцца практычныя заняткі. Вынікам курсаў з'явяцца залікі, пры правядзенні якіх настаўнікі павінны паказаць глыбокія веды па тэарэтычных і метадычных пытаннях. Заліковыя пытанні паведамляюцца курсантам. Заліковая сесія праводзіцца ў выглядзе субяседаванняў настаўніка з выкладчыкам вышэйшай навучальнай установы і метадыстам-практыкам, якія з'яўляюцца членамі заліковых камісій. Пажадана, каб слухачы паказалі ў сваіх субяседаваннях, як ажыццяўляюцца асноўныя праблемы, над якімі працуюць школы.

Мінскі абласны інстытут працуе над праблемамі: маральнае выхаванне, удасканаленне метадаў навучання і выхавання, укараненне перадавога педагагічнага вопыту і навейшых дасягненняў педагагічнай навукі ў практыку работы школы. Пажадана, каб настаўнікі роднай мовы і літаратуры не абмяжоўваліся толькі гэтымі пытаннямі, а расказалі сваім лектарам і метадыстам пра тыя праблемы, якія іх хвалююць у школе, у практычнай дзейнасці. Для нас будзе вельмі каштоўным пачуць ад слухачоў крытычныя і станоўчыя меркаванні пра метадычныя дапаможнікі па беларускай мове і літаратуры, пра метадычныя распрацоўкі і літаратуразнаўчыя манаграфіі, артыкулы і выступленні ў друку, якімі настаўнікі карыстаюцца ў сваёй паўсядзённай працы. Мы спадзяёмся, што слухачы курсаў раскажуць аб тым, якіх літаратурных работ і новых мастацкіх твораў чакаюць яны ад нашых вучоных, пісьменнікаў і метадыстаў.

У педагогаў узнікае і ўсталёўваецца патрэбнасць да паглыбленага вывучэння творчасці пісьменнікаў, культуры народа, прага да эстэтычнага асваення рэчаіснасці. Вядома, што абмежавацца ведамі, атрыманымі пяць, дзесяць, пятнаццаць гадоў назад, ніяк нельга. Відаць, не выратуюць і праслуханыя лекцыі на курсах, хоць яны будуць і самыя дасканалыя. Самаадукацыя — надзейны, шматгадовай практыкай выпрацаваны метад павышэння ідэйна-палітычнага, інтэлектуальнага ўзроўню настаўніка, яго прафесіянальнай загартоўкі, светапогляду. Будзе вельмі добра, калі слухачы раскажуць пра сябе, пра сваіх таварышаў, калег па працы, як яны працуюць у плане самаадукацыі, чаго яны чакаюць ад сваіх старэйшых таварышаў, ад лектараў.

Пажадана, каб слухачы расказалі, над якімі метадычнымі і іншымі творчымі пытаннямі яны працуюць, аб чым клапоцяцца ў сваім паўсядзённым педагагічным жыцці.

За час навучання на курсах удасканалення настаўнікаў педагогі змогуць наведаць літаратурна-мемарыяльны музей народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, Дом літаратараў, Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дом мастацтваў, паліграфічны камбінат і іншыя установы сталіцы.

У літаратурным музеі Янкі Купалы сёлета абсталявана новая экспазіцыя. Гледачы і наведвальнікі ўбачаць і пазнаёмяцца з новымі малавядомымі дакументальнымі і ілюстрацыйнымі матэрыяламі, карцінамі, малюнкамі, створанымі беларускімі мастакамі па матывах і сюжэтах твораў Янкі Купалы.

Цікавы раздзел, прысвечаны пецярбургскаму перыяду жыцця і творчасці паэта, які ахоплівае 1909—1913 гады. Упершыню будзе паказан пакой, у якім жыў паэт, дэманструюцца мэбля, інтэр'ер, прадметы, якімі карыстаўся паэт.

Знаёмства з матэрыяламі музея дапаможа глыбока і грунтоўна вывучыць творчую спадчыну паэта, узбагаціць уяўленне пра гісторыю развіцця беларускай літаратуры.

**М. МАЛОЧКА,**
**метадыст інстытута удасканалення настаўнікаў.**

## ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

Староста... Які ён? Якімі павінны быць адносіны паміж старастай і студэнтамі? Ёсць розныя погляды. Але няправільна думаюць тыя, хто лічыць, што староста—гэта толькі чалавек, праз якога адбываецца сувязь групы, курса з дэканатам.

Староста павінен мець такія якасці, як чуласць, дабрата, уменне стварыць у групе, на курсе атмасферу ўзаемаразумення, дапамогі і дружбы. Ён карыстаецца аўтарытэтам не толькі сярод студэнтаў, але і сярод выкладчыкаў. Менавіта таму староста IV курса журфака Генадзь Марозаў лічыць, што старастамі становяцца па прызванню. Генадзь мае немалы стаж работы: на I курсе—староста групы, потым—староста курса.

— Трэба ўмець з'яднаць калектыў, знайсці падыход да кожнага, прыйсці чалавеку на дапамогу ў цяжкую хвіліну. А для гэтага патрэбны ўзаемаразуменне і давер'е паміж старастай і студэнтамі. Без даверу чалавек не адкрые табе сваю душу, не падзеліцца сваёй бядой і ты не зможаш дапамагчы яму.

Знайсці падыход да кожнага нялёгка, але вельмі важна. Толькі тады ствараецца добры, моцны калектыў.

Група Марозава дружная. І немалая заслуга ў гэтым старасты. Але стварыць здаровую атмасферу ў групе мала; трэба захаваць сяброўскія адносіны да канца вучобы. Між тым мяняюцца людзі, мяняюцца характары, погляды на жыццё. І тут зноў неабходна ўзаемаразуменне.

— Мне падабалася група на I курсе, — гаворыць Марозаў, — цікаўная, рамантычная; на II курсе—задуменная, чулая, дружная...

Дружба і ўзаемадапамога спрыяюць поспехам у вучобе, добрым паводзінам, наогул усім справам. І гэта асабліва адчуваецца ў час сесіі.

— Калі група дружная, дысцыплінаваная, — працягвае Генадзь, — калі яна карыстаецца ў выкладчыкаў аўтарытэтам, калі выдатна скампанаваны расклад залікаў і экзаменаў, то застаецца толькі занесці добрыя адзнакі ў «Экран сесіі». А гэта вельмі прыемна.

**Л. ВАРАНКО,**
**студэнтка.**

## ПІШЫЦЕ НАМ АБ ЛЕЦЕ

**Наперадзе лета — пара вучэбнай і вытворчай практыкі, час адпачынку, паходаў, падарожжаў па краіне. Шмат цікавага ўбачаць студэнты, пазнаёмяцца з новымі месцамі, сустрэнуцца з новымі людзьмі. Як прайшла практыка, аб чым вы даведаліся за час яе праходжання, у якіх цудоўных кутках нашай Радзімы пабывалі?**

**Аб прыгажосці азёрнай Беларусі, аб маляўнічых старонках прыбярэзінскага краю, суровай прыродзе Сібіры, аб цікавых адкрыццях, аб працоўных буднях у час практыкі можна расказаць сваім сябрам, падзяліцца з чытачамі нашай газеты.**

**У месцах праходжання практыкі вы сустрэнецеся з выпускнікамі БДУ, даведаецеся аб іх жыцці, працы. Матэрыялы па гэтых тэматыках будуць змяшчацца пад спецыяльнымі рубрыкамі «Рэха практыкі», «Нашы выпускнікі», якія адкрыюцца ў газеце з 1 верасня.**

**Карціны роднай старонкі, маляўнічыя куткі прыроды, сустрэчы з цікавымі людзьмі надзейна захавае вока фотаапарата. Здымкі, якія вы прывязеце з месц летняй практыкі, будуць апублікаваны ў газеце пад рубрыкамі «Здымаюць фотааматары», «Акно прыроды» і іншымі.**

**Жадаем вам выдатных поспехаў, цікавай практыкі, добрага адпачынку!**



**ПАЧАТАК ЛЕТА — СЕЗОН АБІТУРЫЕНТАЎ. ПЕРШЫМІ ЯГО АДКРЫЛІ ЖАДАЮЧЫЯ ПАСТУПІЦЬ НА ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ НАШАЙ УСТАНОВЫ.**
**НА ЗДЫМКУ: «А КАЛІ ПАЯВЯЦЦА СПІСЫ ПАСТУПІЎШЫХ!» — ЦІКАВЯЦЦА АБІТУРЫЕНТЫ Ў ЧЛЕНАЎ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ.**

**Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.**

## ЯК ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ



**Хутка канец сесіі. Канчаюцца экзамены, запаўняюцца ведамасці; у бібліятэцы — чарга студэнтаў, якія здаюць літаратуру.**

**Як праходзіць сесія на вашым факультэце? Які курс радуе, а які засмучае? Як здаюць першакурснікі? На гэтыя пытанні адказваюць:**

Іраіда Осіпаўна **Царук**, дэкан гістарычнага факультэта:

— Сесія праходзіць арганізавана. Камітэт камсамола, прафсаюзная арганізацыя сочаць за тым, каб звесткі аб паспяховасці студэнтаў своечасова змяшчаліся ў насценгазетах — факультэцкай, аддзяленчаскіх, курсавых. Найбольш паспяхова сесію здаюць студэнты III курса аддзялення гісторыі. Ды і першакурснікі не падводзяць.

Па выніках мінулай сесіі наш факультэт займае II месца па паспяховасці па універсітэту. На днях адбылося пасяджэнне савета факультэта, на якім разглядаліся канкрэтныя прапановы па паляпшэнню падрыхтоўкі студэнтаў да сесіі. А да гэтага на працягу семестра было праведзена 7 сходаў студэнцкага актыву, дзе абмяркоўваліся праблемы паспяховасці і дысцыпліны. Раз у месяц праводзіліся пасяджэнні акадэмічнай камісіі, два разы ў месяц выкладчыкі інфармавалі дэканат аб ходзе падрыхтоўкі да сесіі.

Спадзяюся, што апошнія экзамены не падрыхтуюць ніякіх «сюрпрызаў».

Ігар Аляксандравіч **Паўлаў**, намеснік дэкана механіка-матэматычнага факультэта:

— Нядаўна ў нас адбыўся партыйны сход, адным з пытанняў якога быў ход экзаменацыйнай сесіі. Было адзначана, што адхіленняў ад палажэння аб экзаменах і заліках у ВНУ СССР у нас няма. Заўважу, што да летняй экзаменацыйнай сесіі не былі дапушчаны 3 студэнты факультэта: яны мелі нездавальняючыя адзнакі па прадметах.

У гэтую сесію, як заўсёды, радуюць нас студэнты III і IV курсаў. А вось сярод другакурснікаў 21 чалавек мае двойкі. Ім павінна быць сорамна, бо нават першакурснікі здаюць сесію лепш за іх. Гэта абумоўлена многімі прычынамі: актывізацыяй метадычнай работы на кафедрах, правядзеннем шматлікіх кансультацый, дапамогай у падрыхтоўцы да экзаменаў выкладчыкаў і старшакурснікаў.

З кожным годам на нашым факультэце расце колькасць студэнтаў, якія займаюцца на «добра» і «выдатна». Бягучая паспяховасць падвяргаецца сістэматычнаму ўліку, дэканат сочыць за тым, каб студэнты не былі перагружаны заняткамі.

**Інтэрв'ю правёў**
**В. МАРТЫНЕНКА.**

# ГЭТЫ ДЗЕНЬ МЫ НАБЛІЖАЛІ, ЯК МАГЛІ...



3 ліпеня — дзень вызвалення нашага роднага Мінска — дзень вызвалення Беларусі. Прыкрыўшы далонню твар, сівы ветэран, напэўна, бачыць гэты дзень... Паўразбураныя дамы, рэдкія аўтаматныя чэргі і танк, савецкі танк, які першым уварваўся ў Мінск і ўзвышаецца цяпер на пастаменце ля Акругowага Дома афіцэраў. 3 ліпеня 1944 года Масква салютавала вызваленню Мінска. Па цэнтральных вуліцах Масквы прайшлі 57600 палонных гітлераўскіх салдат, афіцэраў і генералаў, захопленых пры вызваленні Беларусі. Гэта былі тыя, хто прыйшоў на нашу зямлю рабаваць і катаваць, хто пацярпеў катастрафічнае паражэнне.

...Успамінаюць ветэраны. Шукаюць сваіх аднапалчан, сяброў па зброі. А іх з кожным годам застаецца ўсё менш. Ды з кожным днём усё ярчэй і свяшчэнней подзвіг непакораных людзей, былых салдат, пехацінцаў і танкістаў, партызан... Героі жывуць у нашых сэрцах!

Фота А. БАСАВА і А. МАРОЗАВА.





# «АНДРУША»

Так называлася камсамольская падпольная арганізацыя ў Мінску. Кіраваў ёю Мікалай Кедышка — член Мінскага падпольнага камітэта камсамола.

У падвале дома № 56 на вуліцы Магілёўскай размяшчаўся штаб падпольшчыкаў. Тут захоўваліся боепрыпасы і зброя, радыёпрыёмнік і пішучыя машынкі, на якіх друкаваліся лістоўкі і зводкі Савінфармбюро.

Юныя патрыёты не ўпускалі ні аднаго выпадку для расправы з ворагам. Толькі ў 1943 годзе яны зрабілі 40 буйных дыверсій. Узрывы не сціхалі ні ўдзень, ні ўначы. У раёне Козырава Мікалай Кедышка і яго таварышы ўзарвалі на нафтабазе 15 цыстэрнаў з бензінам. Недалёка ад таго месца, дзе цяпер знаходзіцца плошча Якуба Коласа, быў спалены гаспадарчы склад гітлераўцаў. На станцыі Мінск-Таварная ад міны падпольшчыкаў паляцеў у паветра вагон з нямецкімі салдатамі і афіцэрамі. На Маскоўскай дарозе была знішчана машына з гітлераўцамі, а трафеямі камсамольцаў стала зброя ворага і вельмі важныя ваенныя дакументы.

Збіраннем зброі члены «Андрушы» займаліся пастаянна і перапраўлялі яе ў партызанскія атрады. Нямала мужнасці і кемлівасці патрабавала распаўсюджванне лістовак аб падзеях на фронце, аб злачынствах ворага ў акупіраваных гарадах і вёсках.

...У ноч на 7 лістапада 1943 года гітлераўцам удалося выкрыць штаб арганізацыі. Завязаўся страшэнны бой. Сілы былі няроўнымі. Некалькі членаў штаба, у тым ліку і Мікалай Кедышка, загінулі.

Камсамольскаму важаку маладых падпольшчыкаў пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Даўно закончылася вайна. Зноў адбудаваўся Мінск. Выраслі новыя кварталы, паявіліся новыя вуліцы. Адной з іх мінчане далі імя Мікалая Кедышкі.

А вучні 85-й школы на зробленыя імі грошы з дапамогай скульптара К. Д. Гелашвілі ўстанавілі каля школы помнік герою.

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ

# АБ ПРАВАХ І ЛЬГОТАХ ПЕДАГОГАЎ

Агульныя нормы працоўнага заканадаўства, рэгулюючы працу рабочых і служачых, натуральна, распаўсюджваюцца і на настаўнікаў. Але разам з тым ёсць правілы, якія дзейнічаюць толькі ў адносінах працы педагогаў. Яны абумоўлены спецыфікай прафесіі — асобым рэжымам арганізацыі працы і адпачынку.

Кожны настаўнік павінен мець поўную вучэбную нагрузку, устаноўленую законам месячную тарыфную стаўку заработнай платы. Работа з нагрузкай, большай (у школе гэта не лічыцца сумяшчальнасцю) ці меншай, чым прадугледжана тарыфнай стаўкай, дапускаецца толькі з яго згоды.

Для вядучых пачатковыя класы (1—3) памеры месячных тарыфных ставак заработнай платы ўстанаўліваюцца з разліку 24 гадзіны вучэбнай нагрузкі ў тыдзень (чатыры гадзіны ў дзень), а для настаўнікаў старэйшых класаў — 18 урокаў у тыдзень (тры гадзіны ў дзень). Перапрацоўка, класнае кіраўніцтва, загадванне кабінетамі—усё гэта аплачваецца дадаткова.

Настаўнікі сельскіх школ карыстаюцца жыллёвымі і камунальнымі льготамі — ім прадастаўляюцца кватэры з бясплатным ацяпленнем і асвятленнем (па ўстаноўленых у пэўнай мясцовасці нормах). Рашэннем жыллёвага пытання займаюцца вясковыя і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных. Пры адсутнасці свабодных кватэр у ведамасных дамах ці ў дамах мясцовага Савета выканкомы вясковых (пасялковых) Саветаў ці кіраўнікі школ павінны арандаваць жыллё для педагога і яго сям'і, не беручы пры гэтым кошт арэнды з кватарантаў. Не бярэцца плата і за лішак жыллёвай плошчы, калі яна перавышае норму, устаноўленую для пэўнай мясцовасці.

Права на льготы распаўсюджваецца і на членаў сям'і (жонку ці мужа, дзяцей і бацькоў), а таксама на сваякоў і непрацаздольных утрыманцаў, прызнаных членамі сям'і (калі яны вядуць з імі агульную гаспадарку).

Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню ўмоў працы сельскай агульнаадукацыйнай школы» вясковым педагогам устаноўлен шэраг дадатковых льгот. У прыватнасці, льготы на атрыманне крэдытаў на гаспадарчае абзавядзенне і на будаўніцтва жылых дамоў.

Падрабязней з правамі настаўнікаў можна азнаёміцца ў аддзеле народнай асветы ці ў раённым камітэце прафсаюза, які аб'ядноўвае працаўнікоў асветы.

# СТВАРЫЦЬ НАСТРОЙ

Здаўна кветкі служылі сімвалам павагі, любві, адданасці і вернасці. Яны, як добрыя сябры, упрыгожваюць жыццё чалавека.

Увойдзем у чытальную залу прыродазнаўчых навук бібліятэкі. Спакойная працоўная атмасфера, утульнасць, чысціня і — кветкі.

— Як вы адносіцеся да кветак?

— Я ўвогуле люблю іх, — гаворыць крыху збянтэжаная пытаннем студэнтка IV курса механіка - матэматычнага факультэта Ніна Багатырова. — Лічу, што ў чытальнай зале яны вельмі патрэбны. Ад іх неяк хораша на душы становіцца...

З Нінай згаджаецца і другакурсніца хімічнага факультэта Людміла Дрык, і студэнт IV курса фізфака Фам Ву Тхінь.

— Без кветак,—гаворыць в'етнамскі сябар,—было б няўтульна. А паглядзіш на іх,—і прападае стомленасць, паяўляецца натхненне, радасны настрой.

— Па-мойму, кветкі прыносяць людзям эстэтычную асалоду, унутрана ўзбагачаюць,—так адказаў трэцякурснік мехмата Аляксандр Руды.

Такія словы было вельмі прыемна слухаць. Напэўна, я б не знайшоў у чытальных залах чалавека, які б не радаваўся кветкам, не дзякаваў бібліятэкарам за прыемнасць і клопаты аб настроі студэнта.

В. ДУДКО.

ТВОЙ ЭТЫКЕТ

# ІДУЧЫ Ў ГОСЦІ

Пабавіць час у кругу сяброў звычайна бывае вельмі прыемна. З якой бы прычыны вы да іх ні прыйшлі, трэба захоўваць пэўныя правілы ветлівасці.

Калі запрошаны на пэўны час—ніколі не спазняйцеся больш як 15—20 хвілін, старайцеся быць пунктуальнымі, у адваротным выпадку вы замінаеце і гасцям і гаспадарам, ды і сябе ставіце ў не зусім прыемнае становішча: той, хто з'явіўся, калі ўсе ўжо сядзяць за сталом, у разгар бяседы, прыцягвае да сябе ўвагу ўсіх.

Нельга заходзіць у дом, а тым больш у кватэру, з запаленай папяросай. Калі заходзіце ў памяшканне і вас сустракаюць гаспадары, вашы першыя словы прывітання павінны быць адрасаваны гаспадыні. Калі ў прыхожай у гэты час знаходзяцца іншыя госці, ім толькі пакланіцеся, прадстаўляцца не трэба. Праходзячы ў пакой, прапускайце спачатку жанчын і пажылых мужчын. Гаспадыня ідзе перад мужчынамі і маладымі дзяўчатамі, а гаспадар—апошні. Калі ўсе прысутныя вам знаёмы, можаце абмежавацца агульным прывітаннем, а вітацца з кожным паасобку трэба згодна з этыкетам—спачатку з жанчынамі, пачынаючы са старэйшай, а пасля гэтак жа з мужчынамі. Незнаёмым вас павінна прадставіць гаспадыня.

Адзначаць дні нараджэння ў кругу сям'і — старадаўняя традыцыя, таму ў такім выпадку да добрых дружбакоў вы можаце ісці, не чакаючы запрашэння. Але калі вы збіраецеся ў госці да сяброў ці знаёмых, каб праведаць іх, лепш заўсёды загадзя паведаміць ці дамовіцца пра час вашага прыходу. Нечаканы візіт не заўсёды бывае прыемны, зручны—парушаецца пэўны план гаспадароў, яны адчуваюць сябе няёмка, часам не бывае чым пачаставаць, хоць частаваць выпадковага госця не заўсёды абавязкова: можна абысціся шклянкай кавы, чаю.

Калі ж вы прыйшлі нечакана, перш за ўсё трэба проста пацікавіцца, ці не парушылі вы планы сваіх сяброў, знаёмых. Па паводзінах іх, па тону адказу трэба зразумець, ці ў час вы прыйшлі, і адпаведна з гэтым трымаць сябе — заседжвацца ці скараціць візіт да мінімуму. Калі ж вам шчыра прызнаюцца, што ўзяты білеты ў кіно або тэатр, і прапануюць пайсці разам, не крыўдзіцеся. Нечаканы госць ніколі не павінен разлічваць на асаблівую ўвагу з боку гаспадароў.

Калі збіраецеся ў госці з нагоды дня нараджэння, шлюбу, сярэбранага, залатога або брыльянтавага (60) вяселля, радзін, наваселля, заўсёды ўзнікае пытанне аб падарунку. Ніколі не рабіце знаёмым, асабліва тым, хто жыве ў горшым, чым вы, матэрыяльным становішчы, дарагіх падарункаў. Гэта абавязвае і ставіць чалавека ў няёмкае становішча. (Жанчына наогул не павінна прымаць падарункаў ад маланзнаёмых мужчын, выключэннем могуць быць кветкі, цукеркі, кніжкі). Імкніцеся, каб падарунак прынёс чалавеку задавальненне, а не абавязкова быў дарагі, вось чаму трэба ведаць густы, жаданні таго, каму ён прызначан. Вельмі выгадна таму, у каго багатая фантазія, добры густ. Але, на жаль, гэтым адораны не ўсе. Таму трэба старацца ўпотай даведацца, чым цікавіцца віноўнік урачыстасці, што будзе яму прыемна. Пытацца ў юбіляра, што яму купіць—проста непрыстойна. Праўда, бывае, муж жонцы (або наадварот) да імянін хоча купіць адрэз на сукенку, паліто, касцюм, і яны ідуць за пакупкай разам. Але і ў гэтым выпадку, падносячы набытае, трэба дадаць да яго які-небудзь сувенір або кветкі — гэта будзе сюрпрызам.

Сярод моладзі і наогул цеснага кола сяброў у апошні час паяўляецца традыцыя рабіць калектыўныя падарункі. Гэта неблагі звычай для абодвух бакоў: не так накладна для тых, хто віншуе, і юбіляр не атрымае адразу некалькі аднолькавых падарункаў (а гэта часта бывае), да таго ж можна купіць больш цікавую рэч.

Калі ў вас абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці, не адмаўляйцеся ад запрашэння — букет кветак і шчырыя пажаданні заўсёды будуць цудоўным падарункам.

**УСЕ МЫ ПЕШАХОДЫ; АДНЫ — АСЦЯРОЖНЫЯ, СПАКОЙНЫЯ, НЕТАРОПКІЯ, ДРУГІЯ — НЕПАСЛУХМЯНЫЯ, ТЫЯ, ПРА ЯКІХ ГАВОРАЦЬ, ШТО ІМ ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ НЕ ПІСАНЫ. НА ЖАЛЬ, ДА ГЭТАЙ КАТЭГОРЫІ ЧАСТА АДНОСЯЦЬ СТУДЭНТАЎ—НЕПАСЕДЛІВЫ НАРОД. ЧАГО ТОЛЬКІ НЕ ЗДАРАЕЦЦА З ІМІ НА ВУЛІЦЫ!! НЕ РАЗ ВЫРАТОЎВАЛІ МАЛАДОЕ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗІ Ў ФОРМЕ САВЕЦКАЙ МІЛІЦЫІ. СЁННЯ НАШ РАСКАЗ ПРА АДНАГО З ІХ. РЫГОРА АПАНАСАВІЧА ШАСТАКОВА ДОБРА ВЕДАЮЦЬ МНОГІЯ СТУДЭНТЫ.**

# СЛУЖБА ТАКАЯ

Вельмі трапна сказана: чалавек народжан для шчасця, як птушка для палёту. Ён, Шастакоў, цалкам згодзен з гэтымі словамі. Толькі чаму ж адзін чалавек бывае шчаслівы, а другі — не? І ў чым яно—шчасце? Што ляжыць у яго аснове?

Адказаць на ўсе гэтыя пытанні не так проста. Ды і наўрад ці можна адказаць з вычарпальнай паўнатой. Кожны разумее шчасце пасвойму, у кожнага яно сваё. І усё ж — Рыгор Апанасавіч у гэтым цвёрда пераканан — не можа быць па-сапраўднаму шчаслівы чалавек, калі работа, якую ён выконвае, не прыносіць яму задавальнення.

На скрыжаванні вуліцы Валадарскага з Ленінскім праспектам часова адключылі электраасвятленне. Патухлі агні светафораў. А быў час «пік» — перапоўненыя тралейбусы і аўтобусы ішлі па праспекту, збіраючыся на скрыжаванні разам з таксі і патокамі пешаходаў.

Старшыну Шастакова я застаў у самым цэнтры гэтага шумлівага мора. Работа яго займала многіх людзей. Каля міліцэйскага паста, на тратуарах, яны спыняліся і любаваліся ім. Рэзкія ўзмахі рукі з рэгуліровачным жазлом, імклівыя і дакладныя павароты — усё ўражвала маладой энергіяй.

...У 1951 годзе пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі прыйшоў Шастакоў у ДАІ Мінска. Цяпер Рыгор Апанасавіч — адзін з лепшых інспектараў дарожнага нагляду сталіцы.

...Звонка смеючыся, размахваючы моднымі сумачкамі, дзве дзяўчыны пабеглі праз праспект на чырвонае святло і ледзь не трапілі пад колы аўтобуса. «Спяшаліся на лекцыі, не заўважылі...», — пачалі разводзіць рукамі студэнткі. Адной размовы аказалася недастаткова — прыйшлося іх аштрафаваць.

...Вось зрабіў няправільны паварот вадзіцель «Волгі». З аўтамабіля працягваецца рука з шафёрскімі дакументамі — рабі пракол, штрафуй, заслужыў! Старшыня ўважліва азнаёміўся з паперамі і нечакана сказаў:

— Мая вам парада: задумайцеся над тым, колькі бяды можаце прычыніць сваёй недысцыплінаванасцю не толькі сабе, але і другім людзям.

Шастакоў і строгі, і добры. Штраф для яго — не самамэта. Адчуваецца, што ён шукае магчымасць не ўжываць гэтую меру пакарання. Яму важна дабіцца галоўнага — чалавек, які парушыў правілы вулічнага руху, павінен пайсці ад інспектара з цвёрдым намерам быць у далейшым засяроджаным і асцярожным на дарозе. Ён умее пераконваць, у яго кароткіх гутарках з пешаходамі і вадзіцелямі пераважае педагог.

А яшчэ я назіраў такі выпадак... Старэнькая бабуля збянтэжана мітусілася на краі тратуара, спрабуючы перайсці на процілеглы бок вуліцы. Нарэшце, заўважыўшы шырокі разрыў у калоне транспарту, кінулася праз вуліцу. Лёгка ўявіць, што магло адбыцца ў наступную секунду, калі б у час не падаспеў старшына. Ён імгненна выкінуў руку з рэгуліровачным жазлом. Пранізліва завішчалі тармазы. Машына спынілася літаральна ў некалькіх сантыметрах ад перапалоханай старой жанчыны. Інспектар падышоў да яе і, напэўна, хацеў зрабіць строгую вымову. Але, убачыўшы, што старэнькая ўся дрыжыць ад страху, беражліва ўзяў яе пад руку і, не спяшаючыся, перавёў на другі бок вуліцы.

— Нельга ж так, бабулька, рызыкаваць сваім жыццём... Будзеце вяртацца назад, паклічце мяне, я дапамагу вам перайсці дарогу...

— Працу сваю люблю, — не без гонару гаворыць Рыгор Апанасавіч, — толькі вынікамі пакуль што не задаволен. Самае галоўнае і прыемнае для нас, калі няма аварый. Але так, на жаль, бывае рэдка. Яшчэ многа вадзіцеляў і пешаходаў не ў ладах з дысцыплінай. Таму і адчуваеш незадаволенасць.

Неабходна дадаць, што за бездакорнае выкананне службовых абавязкаў Р. А. Шастакову прысвоена званне выдатніка міліцыі. Званне заслужанае.

**А. БОГДАН,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

У АБ'ЕКТЫВЕ—ПРЫРОДА



На світанні. Фотаэцюд Г. Марозава.

# МАТЭМАТЫКІ ЛЮБЯЦЬ ПЕСНЮ

Амаль кожны факультэт БДУ мае свой любімы від мастацкай самадзейнасці. Напрыклад, студэнты геаграфічнага факультэта на ўсіх конкурсах уражваюць дасканаласцю танца, філолагі — майстэрствам дэкламацыі, масавасцю хору. А матэматыкі любяць песню.

...У маіх руках стос ватманскіх лістоў — аб'яў. Гартаю. Снежань— выступленне маскоўскага ансамбля песні пад кіраўніцтвам С. Нікіціна; люты — канцэрт выканаўцаў самадзейнай песні г. Мінска; сакавік — музычны вечар В. Фёдарава, аўтара і выканаўцы турыстычных песень; красавік — творчая сустрэча з акцёрам тэатра на Таганцы Д. Мяжэвічам. У планах — выступленне мастацтвазнаўцы А. Смагіна.

Студэнты цікавяцца песняй усур'ёз. Гэта не «мода» на музыку, а імкненне ўзбагаціць сябе, сваю душу. Як нараджаецца мелодыя? Ці можна даць прагноз музычнага эфіра на заўтра? Шлягер, патрэбен ён ці не? Адказы на пытанні няпростыя. Ідзе абмеркаванне, што пяецца і як пяецца, расце музычная культура. Але галоўнае — багаж ведаў і назіранняў выкарыстоўваецца на практыцы. Калісьці матэматыкі на унутрыуніверсітэцкіх конкурсах мастацкай самадзейнасці займалі адно з апошніх месц. А сёння — трэцяе, прызавое.

Імкненне да песні—пачуццё стыхійнае. Накіроўвае яго ў пэўнае рэчышча, займаецца арганізацыяй вечароў і сустрэч камітэт камсамола факультэта, а дакладней — сакратар камітэта Вера Прокашава.

І тут дарэчы ўспомніць мінскі гарадскі клуб самадзейнай песні «Свіцязь», які існуе ўжо 8 гадоў. Вера — член праўлення клуба. З матэматыкамі «Свіцязь» падтрымлівае сяброўскія кантакты даўно, накіроўвае да студэнтаў калектывы, майстэрства якіх набліжаецца да прафесійнага. Відавочна, што такая садружнасць дае плённыя вынікі.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



У кожнага ёсць сваё любімае месца для падрыхтоўкі. Фота Т. Петрашкевіч.

# МАНАГРАФІЯ ПА ГІДРАЛОГІІ

Замкнутыя моры поўдня СССР — Каспійскае і Аральскае — прадстаўляюць сабой цікавейшыя прыродныя аб'екты, вывучэнне якіх мае першараднае навуковае значэнне.

Абодвум морам прысвечана шмат літаратуры. Аднак вялікая частка яе базіруецца на значна застарэлых даных і прадстаўляе ў асноўным гістарычную цікавасць.

У пасляваенны перыяд на Каспійскім і Аральскім морах былі праведзены шырокія экспедыцыйныя даследаванні, дазволіўшыя атрымаць новыя цікавыя матэрыялы. Яны паслужылі асновай кнігі А. Н. Косарава «Гідралогія Каспійскага і Аральскага мораў» (выд. МДУ, 1975). Кніга напісана на аснове шырокага фактычнага матэрыялу, апрацаванага самымі сучаснымі метадамі, з прыцягненнем усіх сучасных літаратурных крыніц. Вельмі каштоўна тое, што аўтар сам праводзіў і здзяйсняў кіраўніцтва шматгадовымі даследаваннямі на Каспіі. Усё гэта дазволіла яму стварыць кнігу, у якой даецца дэталёвы аналіз усёй супольнасці гідралагічных працэсаў, фарміруючых сучасны прыродны абрыс Каспійскага і Аральскага мораў. Яна прадстаўляе сабой значны ўклад у рэгіянальную акіinduлогію і ў значнай меры папаўняе існуючы прагал у вывучэнні гідралогіі унікальных замкнутых мораў — Каспія і Арала—на сучасным этапе іх развіцця.

Кніга А. Н. Косарава—арыгінальная творчая праца з новымі навуковымі ідэямі і своеасаблівым падыходам да рашэння складанай праблемы. Яна не толькі падводзіць вынікі праведзеных даследаванняў, але і адкрывае перспектывы на будучае. Змешчаныя ў манаграфіі шматлікія навуковыя і даведніцкія даныя знойдуць шырокае прымяненне пры рашэнні самых разнастайных пытанняў, асабліва ў мэтах стабілізацыі і падтрымкі ўзроўняў Каспійскага і Аральскага мораў у найбольш аптымальным, выгадным для народнай гаспадаркі краіны стане.

**А. ШКЛЯР,**
**доктар геаграфічных навук, прафесар.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Я. ЕСЕПКИН

## ВХОДЯ В ПРИРОДУ



Входя в природу, оставляйте в городе
Невысказанность очень верных мыслей,
Асфальтом наколдованные горести
И выходной костюм под стрелкой в мыле.
Не увлекайтесь пряными консервами,
Ножами крепкой заводской отточки,
Не злоупотребляйте лишним сервисом —
Он может повредить ольховым почкам.
Не трогайте рукой берез молитвенность,
Чтоб сок испить природной высшей марки,
Запомните, что у ольхи с малинником
Бывает тоже день 8-е марта.
Забудьте о пластинок граммофонности —
К вам музыка придет гораздо чище,
Когда вы, в вербной растворясь симфонии,
Устроитесь на смятом пиджачишке
И будете от нот волшебных нежиться,
Тревожиться — неприглашенным гостем.
Входя в природу, прихватите нежности,
Немножко нежности. А остальное — бросьте!

С. МЕЛЬНИКОВ

## ВОЗВРАЩЕНИЕ

Прошлое вернется бумерангом,
Так нежданно заревом вразлет...
Улица подхватит это танго,
И труба рассвета подпоет.

День растает, пыльный и тягучий,
В мареве хозяйственных страстей.
Это повторится, это будет...
И полет высокий сизарей.

Вдаль взирать с улыбкой сонной будут
Окон серебристые глаза,
И дома — таинственные будды —
Вдруг очертит молнией гроза.

Я пойду, обнявшись с нею теплой,
По аллеям парка в пасть ночи.
Запах мне запомнится болотный,
Звонкие холодные ключи,

В возвращеньи—влажная дорога,
Тихое раздумье, как меня
Грустью встретит мама у порога,
Голову по-вдовьи наклоня.

## ПОЕЗД

За окнами тьма, за окнами тьма,
Спокойная, мягкая, только мгновенье
Наполнено возгласом фонаря,
Неуспокоенностью повторенья.

Холодные блики дрожат на стекле,
Зло семафор подмигнул синим глазом,
А в печке уголья, как розы в золе,
Мерцают букетом оранжево-красным.

На стыках—бессилье и сила литья
В застегнутой туго уздечке грохочет,
А я не робею, но эта судьба
И с нею душа согласиться не хочет.

Тревожен гудок, тревожен гудок,
И сна наплывают воздушные формы.
Осталось немного—последний рывок...
Летят, словно птицы стальные, платформы.

В. РОЩИН

## АЛОЕ И БЕЛОЕ

Выходили замуж яблони.
Поголовно шли.
Беспечаленно.
Наряжались не шутя
они
В платья белые,
подвенчальные.
Прилетали неизменные—
Гости верные—птицы
семьями,
Пели песни—ах!
и целебное
Пили солнышко, словно
зелие.
И на всем почти
полушарии
Белый пир стоял
замечательный.
Люди мимо шли.
Замечали ли?
Разве это им
обязательно?
Только вот опять,
загрустившие.
Стали яблони
вновь опавшими,
Белый цвет одежд
потерявшими,
Как в невестах все
походившие,
Только замужем
не бывавшие.

* * *

Рано-рано утречком
На росистый луг
С самодельной дудочкой
Выходил пастух.
Шел, как бы вступая в мир
В новый, налегке.
Шел пастух туманами,
Словно в молоке.
Лишь к утру избавившись
От ветров-гулях,
Рощицы-ныряльщицы
Спали на холмах.
Выливаясь лавою
На восточный склон,
В чаше неба плавилось
Алое стекло.
И играл на дудочке,
Словно дул шары,
Рано-рано утречком
Стеклодув зари.

* * *

В каменном городе
по каменной площади
Скачут без седел и без
подков
Незабываемо
белые лошади,
Дикие лошади снов.
Белыми гривами
ночи растрепаны.
В поисках пастбища до утра
Снов моих лошади
тычутся мордами
В черный асфальт автострад.
Звуками города,
ровно по-волчьему,
Травятся белые лошади
снов.
Ночи кончаются
белыми клочьями
Канувших в бездну утра
табунов.
Но по-над грохотом
каменной площади,
Над корпусами, машинами,
над...
Снов моих лошади, белые
лошади
Кормят своих жеребят.
Я забываю их ночью
бессонною,
Но засыпаю, и видится
вновь:
Белые лошади рысью
исконною
Скачут в тревожной ночи
городов.



Лідзеры. Фота А. Басава.

И. РОДИОН

## ПУШКИНУ

Он был так сказочно
богат,
Что сам не знал своих
владений,
Своих таинственных
видений—
Он был так сказочно богат.
Перо бессмертье покорило,
И славу пели соловьи.
А сердце жаждало любви...
Перо бессмертье покорило.

## БУСЛІНАЕ ГОРА

### НАВЭЛА

У гэты дзень у вёсцы было вяселле. Не змаўкалі песні, сыпаліся жарты, смех... А над нашымі галовамі ў блакітным небе кружылі буслы. Яны часта прылятаюць сюды, і над вёскай раздаецца іх тужлівы клёкат.

...Успамінаецца старэнькая бяроза, якая расла непадалёку. Памятаю, яе аблюбавала і пасялілася тут гэтая пара буслоў. Бяроза была згорбленая, падгніўшая на карэннях. Не адно пакаленне буслоў выгадавалася на яе скроні. Але гэтай пары не пашанцавала. Аднойчы прайшла страшэнная навальніца. Не вытрымала старая бяроза, са стогнам павалілася на сярэдзіну вуліцы. Не зберaглі сваіх буслянят птушкі. Узняліся самі ў паветра, а дзеці лятаць не ўмелі. Мы, малыя, назаўтра знайшлі забітых буслянят. З таго часу, як толькі прылятаюць з выраю буслы, падоўгу кружацца над тым месцам, дзе расла старая бяроза...

**Мікола КУРГАНСКІ,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

ГУМАР

## МЯСЦОВАЯ ХРОНІКА

Калі дэкан, назваўшы вас па прозвішчу, цікавіцца імем па бацьку—к загаду.

Калі ў канцы семестра выкладчык у адказ на ваша «добры дзень» здзіўлена глядзіць на вас—к незаліку.

### РАЗМОВА У СТАЛОЎЦЫ

— Ты ўжо здаў экзамен?!
— Не, гэта я толькі такі маю выгляд.

### КАРЫСНАЯ ПАРАДА

Збіраючыся на экзамен, пакладзіце пад пяту паўрубля. Што б ні здарылася, грошы вам заўсёды спатрэбяцца.

### НАШЫ БУДНІ

У разгар напружанага працоўнага дня наша чытачка Ніκалаенка Таня прынесла ў рэдакцыю арыгінальны матэрыял. Ён так спадабаўся супрацоўнікам рэдакцыі, што ў адзін момант разышоўся па 21 рублю за метр.

## З АДКАЗАЎ СТУДЭНТАЎ БІЯФАКА НА ЗАЛІКАХ І ЭКЗАМЕНАХ

Розніца паміж вышэйшымі і ніжэйшымі раслінамі заключаецца ў тым, што вышэйшыя расліны высокага росту, а ніжэйшыя—нізкага.

* * *

Сабака — жывёліна членістаногая.

* * *

Па берагах акіянаў растуць кенгуру і мангуру.

* * *

Калі жыў Ліней, дакладна не памятаю, але недзе ў архейскую эру.

* * *

У пустынях растуць дрэвы, у якіх няма ствалоў і лісця.

* * *

Магнолія належыць да сям'і магнатаў.

## НАШ МЕНШЫ БРАТ

У апошні час праблема першакурсніка стала выключнай. Ужо зараз можна пераканацца, што да 2000 года першакурснікі складуць 87,3 працэнта насельніцтва горада Мінска.

Кожны з нас па меры магчымасці быў першакурснікам. Цікавыя людзі з парадаксальным мысленнем. Я і цяпер памятаю, як да слёз смяяўся мой выкладчык, калі я яму ў свой час заявіў, што забыў сшытак з дамашнім заданнем дома.

Самыя вясёлыя, самыя дапытлівыя людзі — першакурснікі; у іх яшчэ ёсць цяга да ведаў і да рамантыкі. Іх хвалююць словы «семінар», «калёквіум», «кафедра». Яны яшчэ блытаюць парабалічны гіпербаліод з гіпербалічным сінусам, але ўжо ведаюць, што такое стыпендыя.

Аб дапытлівасці першакурснікаў ведае кожны. Так, адзін з іх па рассеянасці папаў на лекцыю да V курса. На другой гадзіне лектар назаўсёды пазбавіўся звычкі перарываць манатонны ход лекцый словамі: «Пытанні ёсць?..»

Агульнавядомы і такі факт, што першакурснікі хаця і складаюць 20 працэнтаў насельніцтва універсітэта, з'ядаюць 80 працэнтаў піражкоў з мясам і рысам. Не, апетытам асаблівым яны не вызначаюцца; уся справа ў наведванні, за што, дарэчы, і любіць першакурснікаў адміністрацыя.

Увогуле, першакурснікі — цвет студэнцтва.

**Дацэнт КАМПОТАЎ.**

(З насценгазеты мехмата «Решим любую задачу»).

## ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ ПАРАДЫ

**БУДЗЬ СТРЫМАНЫ.** Атрымаўшы «здавальняюча», не кідайся экзаменатару на шыю. Падумай, што б ты рабіў, калі б атрымаў «добра».

**БУДЗЬ ТАКТОЎНЫ.** Калі выкладчык сам адказвае на твой білет, не перабівай яго словамі: «Цалкам згодны!», «Я таксама так думаю».

**БУДЗЬ САМАКРЫТЫЧНЫ.** Не запэўнівай педагога: «На лекцыях нам гэтага не давалі!», а сціпла адзнач: «У маіх канспектах гэтага няма».

**БУДЗЬ АПТЫМІСТАМ.** Прыйшоўшы здаваць фізіку і даведаўшыся, што сёння экзамен па хіміі, не засмучайся. Усё яшчэ наперадзе: і экзамен па фізіцы, і пераэкзаменоўка па хіміі.

**В. а. рэдактара
В. А. ВОЛЬСКІ.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 00249 Заказ № 898

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.